**Аддзел адукацыі, спорту і турызму Ельскага райвыканкама**

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**

**“Рамязоўскі яслі-сад-сярэдняя школа Ельскага раёна”**

# Раённы фестываль

# “Браму скарбаў сваю адчыняю”

# Зімовыя святы

**(для вучняў 1 – 4 класаў)**

Распрацавана мерапрыемства настаўнікам пачатковых класаў Любінай Аленай Аляксандраўнай

Мерапрыемства праведзена настаўнікамі пачатковых класаў Козыравай Тамарай Паўлаўнай, Лось Святланай Сцяпанаўнай, Уласенка Таццянай Міхайлаўнай

Дзяржаўнай установы адукацыі “Рамязоўскі яслі-сад-сярэдняя школа Ельскага раёна”

**Рамязы 2014**

**1 вядучы**. Добры дзень, людзі добрыя! На вуліцы снег, мяцеліца, мароз такі, што страх.

**2 вядучы**. Нездарма беларуская прыказка гаворыць: "Калі не будзе зімой бела, то не будзе ўлетку зелена".

**1 вядучы**. Снежань - першы зімовы месяц, і называюць яго так таму, што ён снежны.

**2 вядучы**. Снежань, снежань, які чараўнік!

Да акна цёмнай ноччу прынік.

І малюе на шкле дзіўны сад,

Нібы лета вяртае назад.

**1 вядучы**. Зямлю грудзіць, хаты студзіць, год канчае, зіму пачынае.

**2 вядучы**. Якія прыкметы снежня вы ведаеце?

1. Калі будзе снежань сухі, (хто ведае, што будзе?) то вясна і лета будуць сухія.
2. Калі ў снежні мароз і снег вышэй хаты, (што будзе?), то год будзе багаты.
3. Калі ў снежні пагода, (якая тады вясна будзе?) пагодная і ранняя.

**1 вядучы**. У гэтым месяцы і пачынаюцца зімовыя святы.

*Сялянская хата. Гаспадар, гаспадыня. Сядзіць бабка Аўдоцця і прадзе, вакол яе некалькі жанчын, моладзь.*

**Вучань**. Бабка Аўдоцця, раскажыце нам усім, як даўней праводзіліся вечары ў Піліпаўку. Вы ж самая старэйшая і, напэўна, помніце.

**Бабка Аўдоцця.** Як жа мне не помніць, усё да драбніц прыпамінаецца. Ну так слухайце! 3 28 лістапада па 7 студзеня - Піліпаўка. Пачынаецца пост. Гэта той прамежак часу, калі праца на полі скончана. На Піліпаўку (Піліпаўскі пост) царква забараняла ўсялякія гульні, забавы, вяселлі. У такія доўгія зімовыя вечары моладзь збіралася ў хаце на вячоркі. На вячорках, прадучы кудзелю, вышываючы, спявалі песні. Песні былі часцей за ўсё сумныя, журботныя. У іх

апяваліся майстэрскія, здатныя рукі сялянкі, лес дзяўчат. Вось паслухайце адну з іх.

***Песня***

**1-я дзяўчына**. Засядзеліся мы тут, трэба дадому разыходзіцца, работа чакае, патрэбна да Каляд прыбірацца. Усяго добрага! Да пабачэння!

**2-я дзяўчына**. Яно ж так. Хадзем, дзяўчаткі, кабеткі!

**2 вядучы.** Зімовыя сяткі пачынаюцца пасля поснай куцці 6 студзеня і завяршаюцца на Вадохрышча – 19 студзеня.

*Усе выходзяць, акрамя гаспадыні і гаспадара.*

**Гаспадыня.** Буду і я ў хаце прыбіраць, бо хутка Каляды. Можа, і ў хату хто зойдзе. Калядоўшчыкі, мабыць, будуць хадзіць.

**Гаспадар.** Ды і я пайду, можа, што па гаспадарцы зраблю.

**Гаспадыня.** *Прыбіраючы хату, падпявае.*

Ой, калядачкі, вы прыйдзіце к нам.

Вы прыйдзіце к нам, а мы рады вам.

Ой, піліпаўка, надакучыла,

Сваім постам нас замучыла.

**1 вядучы.** Каляды самыя доўгачаканыя і цікавыя, бо ўжо скончылася Піліпаўка (пост) і пачынаюцца святы.

**2 вядучы.** Студзень - году пачатак, а зіме - палавіна.

**1 вядучы.** Я вам раскажу, як раней святкавалі Калядкі. Наогул, калядныя святы працягваюцца з 25 снежня да 7 студзеня, а само свята Каляды пачыналася з вечара 6 студзеня і святкавалася 7 студзеня. Напярэдадні свята, значыць 6 студзеня, увечары наладжваюць куццю. Куцця ўяўляе сабой разнастайную посную вячэру.

**2 вядучы**.Хто з вас ведае, дзе ставілі стол у гэты вечар для вячэры?

**Вучань.** На покуці хаты.

**1 вядучы**. Чым накрывалі стол і што клалі на яго?

**Вучань.** Стол накрывалі абрусам, а пад абрус клалі сена.

**Вучань.** Усе сядалі за стол, гаспадыня падавала па чарзе абавязковыя для куцці стравы: аладкі, печаныя на алеі, крупнік, аўсяны кісель, вараны гарох у сухім выглядзе. А яшчэ запальвалі свечку, каб ўсё дрэннае, што было ў мінулым годзе згарэла.

**1 вядучы**. Я зараз запалю свечку, а вы, гледзячы на яе полымя ўспомніце пра сябе: можа вас хто пакрыўдзіў, а можа вы каго пакрыўдзілі, падманулі, каму сказалі дрэннае слова. Хай вашы непрыемнасці згараць у гэтым полымі і больш не паўторацца.

**2 вядучы**. Скажыце, а што рабілі з сенам, якое ляжала пад абрусам?

**Вучань.** У наступную раніцу глядзелі, якіх зярнят болей засталося пад сенам. Гэта азначала, які ўраджай будзе ў наступным годзе. Выцягвалі сяніну і па яе даўжыні меркавалі, якім вырасце лён у новым годзе. Само сена гаспадар аддаваў жывёле, як засцярогу ад хвароб.

**1 вядучы**. Што ж такое Каляда?

**2 вядучы**. Каляда – святочны хрысціянскі абрад – хаджэнне па дамах з віншаваннямі і песнямі, з атрыманнем пачастунку ці грошай.

**1 вядучы**. З якімі песнямі сустракалі Новы год?

**2 вядучы**. З калядкамі. Гэта песенька, якая ўсхваляе Каляду. Але ж ніхто не ведае, хто такая Каляда.

**1 вядучы**. Хто ж і каму спяваў гэтыя песні?

**2 вядучы**. Калядуючыя пераапраналіся і надзявалі маскі, касцюмы, адлюстроўваючыя розных жывёл: казу, мядзведзя, іншых жывёл.

**1 вядучы**. А вы хацелі б пакалядаваць?

*Ідуць калядоўшчыкі, нясуць звязду, спяваюць. Цыганка вядзе каня, цыган вядзе мядзведзя, дзед вядзе казу, побач тупае журавель.*

Калядкі блізка, кілбаскі нізка,

Ой, шчодзер, бодзер,

Наш Ваня злодзей.

Украў кароўку, загнаў за горку,

Ой, шчодзер, бодзер,

Наш Ваня злодзей.

Украў авечку, замчаў за рэчку,

Ой, шчодзер, бодзер,

Наш Ваня злодзей.

Калядкі блізка, кілбаскі нізка,

Ой, шчодзер, бодзер,

Наш Ваня злодзей.

**2 вядучы**. Запрашаем на Калядкі.

*Спяваюць песню "Добры вечар".*

Добры вечар, шчодры вечар,

Усім людзям на ўвесь вечар.

А ці дома пані твая? Я бачыў, што дома.

Яна дома не гуляе, піражочкі рашчыняе.

А ці дома гаспадар? А я бачу, што ён дома.

Што дома не гуляе, чалядоўку даглядае.

Добры вечар, шчодры вечар,

Усім людзям на ўвесь вечар.

**Цыганка.** Ці дома нашы гаспадары?

**Гаспадары**. Дома, дома!

**Цыганка.**

Ой, я знаю, што вы дома.

Вынесь, пані, піражочка,

Хоць малога ды смачнога.

**Гаспадыня.** Калі ласка, паспытайце пірагоў.

**Гаспадар.** Адкуль вы ідзяце, людзі добрыя?

**Дзяўчына.** Ідзём мы ад пана года, што носіць бараду шыроку, як лапату, сіву і калмату.

**Дзед**. Мы к лету ідзём, казу вядзём і радасць нясём.

*Журавель ходзіць, дзюбае ўсіх, усе спяваюць.*

Лезь каза на кол, пакажы хахол.

Го-го-го, каза, го-го-го, шэрая!

Дзе каза хвастом, там жыта кустом.

Го-го-го, каза, го-го-го шэрая!

**Гаспадар.** Да нас калядаваць прыйшлі цыганы. Паваражыце, судзьбу-долю разгадайце.

**Цыганка.** Мы паварожым вам, добрыя людзі! Скажам, што было, што будзе. Што на сэрца лягло, а што ў ногі пайшло.

*Цыганка варожыць.*

**1 вядучы**. Калядныя варожбы, яшчэ адзін паэтычны штрых да духоўнага жыцця нашых дзядоў і прадзедаў. Яны былі ўцехаю і забаваю, бо заўсёды неслі чалавеку надзею.

**2 вядучы**. Згадзіцеся, каму з маладых не хацелася б пранікнуць у будучыню, даведацца пра суджанага-раджанага, сямейны лёс? Ці не так?

**1 вядучы**. Вось мы з вамі паварожым, паспрабуем акунуцца ў гэтыя таямнічыя скарбы мінулага! Пачынаем. (запальваецца яшчэ адна свечка. Вось гэту свечку вы перадавайце адзін аднаму. І ў каго гэта свечка застанецца –той самы шчасны на нашым сённяшнім свяце. *(у каго свечка засталася па заканчэнні-той выходзіць да вядучай.)*

**2 вядучы**. Вось наша першая ўдзельніца варожбы—самая шчасная дзяўчына на нашым святе. Выберы сабе яшчэ сяброўак і мы пачнём варажыць.

**1 вядучы.** На калядкі ўсе дзяўчаткі вось як варажылі: выходзілі на двор, абдымалі частакол, калі была цотная колькасць—хутка быць у пары, а калі

няцотная—у гэтым годзе яшчэ не стрэнецца з суджаным. А мы гэта праробім з сянінамі. *(Дзяўчаткі цягнуць сена з-пад абруса. Лічаць колькасць сянінак).*

**2 вядучы**. Вось і спазналі, хто ў гэтым годзе будзе ў пары. Але згадзіцеся, кожнай дзяўчыне цікава ведаць, ці раней яна за сваіх сябровак пойдзе замуж. І вось што для гэтага рабілі: скінуўшы чаравік, мералі ім дарогу ад покуці да парога. Чый першы ля парога апынецца, тая напярод замуж пойдзе. Зараз і мы паспрабуем так паваражыць. *(Дзяўчаты здымаюць па чаравіку і ад покуці да парога адна за адной мераюць ім дарогу).*

**1 вядучы**. Мы даведаліся, каму ў гэтым годзе ў пары быць, і хто раней замуж пойдзе. Але ж яшчэ цікава ведаць, якога нораву будзе ваш суджаны. Вось у мяне, дзяўчаткі, на стале ляжыць нейкая рэч накрытая сурвэткай. Зараз кожная дзяўчына выбярэ сабе якую-небудзь талерку, і па рэчы мы даведаемся, якога нораву будзе ваш суджаны!

***На талерках ляжаць:*** чарка (будзе трошачкі выпіваць), люстэрка (будзе прыгажун), зерне (працавіты і старанны), кніга (разумны), шчотка (злосны, з характарам), ключы ( гаспадарлівы).

**2 вядучы**. Ці спадабаліся вам варожбы? *(Вядучая бярэ талерку з зернем, у якой ляжаць пярсцёнкі розныя)* Вось у мяне талерка з зернем. Але ж яна не простая. У гэтай талерцы ляжаць пярсцёнкі розныя. Зараз кожная дзяўчына, да якой я падыду, возьме па жмені зерня, і па тым, які пярсцёнак ёй дастанецца, мы даведаемся аб дастатку вашага кавалера.

**1 вядучы**. Калі дастаўся залаты пярсцёнак—значыць, сустрэнецца хлопец багаты-багаты; срэбны—прыйдзе хлопец у сваты з сярэднім дастаткам; просты пярсцёнак –сустрэнецца вельмі шчодры хлопец, не вельмі багаты, але ж вы будзеце вельмі кахаць адзін аднаго. Пярсцёнак з камянём- сустрэнеца дзяўчыне не проста хлопец, а нават паніч. Калі ўзяла адно зерне—у гэтым годзе ніякі хлопец не сустрэнецца, але хто ведае—можа, гэта і к лепшаму? Ёсць час падумаць.

**2 вядучы**. Хто скажа, пад якім знакам будзе праходзіць гэты год? Так, год Пеўня. І наступнае гаданне дапаможа правесці пеўнік. Але спачатку вы выцягніце паперкі з нумарамі, каб ведаць, якая дзяўчына пад якім нумарам. Уважліва сачыце за пеўнікам, што ён будзе рабіць.

*(Гучыць вясёлая музыка. Да дзяўчат выходзіць пеўнік. Спачатку ён ходзіць, аглядаючы дзяўчат.)*

**1 вядучы**. Бачыце, дзяўчаткі, наш пеўнік ходзіць ды паглядае. Гэта значыць, што першай дзяўчыне дастанецца муж-аграном.

*(Певень махае крыламі).*

**2 вядучы**. А вось другой дзяўчыне дастанецца муж-лётчык.

*(Певень кукарэкае)*

**1 вядучы**. Глядзіце, наш пеўнік спявае. У трэцяй дзяўчыны будзе муж-артыст.

*(Яшчэ певень можа біцца—муж будзе міліцыянер, бегчы—спарцмен, кляваць—дырэктар рэстарана, грабсці лапай –трактарыст).*

**2 вядучы**. Дзякуй табе, пеўнік, дзякуй вам, дзяўчаткі. Сядайце, калі ласка.

**Гаспадар.** Міласці просім усіх да стала.

**Гаспадыня**. Дыхае цяплом калядная куцця.

**Хтосьці з гасцей**. Пакалядавалі ў адной хаце, у другой, а зараз пойдзем далей. Дзякуем вам, гаспадыня і гаспадар, за вашы пачастункі.

**1 вядучы.** Вось так спакон вякоў людзі святкуюць Калядкі.

**2 вядучы**. Наступнае студзеньскае свята - "Шчадрэц".

**1 вядучы**. Гэта вясёлы народны звычай. Вечар гэты - асаблівы. І самы цікавы момант такога вечара - шчодрая вячэра. Кожная гаспадыня старалася згатаваць багатую скаромную вячэру і сустрэць Новы год у поўным дастатку.

**2 вядучы**. На ролю Шчадраца звычайна выбіралі высокага статнага хлопца, якога апраналі ў старое рознакаляровае адзенне, абвешвалі званочкамі і шархунамі. На галаву надзявалі шапку з бліскучай паперы, з-пад якой падалі

доўгія валасы з пянькі, лёну ці конскага хваста, на твар накладвалі маску з чырвонымі шчокамі і доўгім носам, пад верхняе адзенне на спіне змяшчалі розны хлам, каб зрабіць горб. У рукі Шчадрацу давалі тоўстае жазло, аздобленае рознакаляровымі каснікамі, саджалі на адмыслова зроблены дзеля гэтага выпадку вазок, асветлены ліхтарамі і абвешаны шархунамі. Моладзь рабіла рытуальны абход аднавяскоўцаў на шчодры вечар, спявала песні.

*Гаспадыня і гаспадар збіраюць на стол.*

**Гаспадар.** Хутчэй, Ганна, збірай на стол, бо хутка прыйдуць шчадраваць дзяўчаты ды хлопцы.

**Гаспадыня**. Цярэшка, а ты таксама мне дапамажы, бо ўжо, чуеш, музыка, песні, смех на вуліцы. Вось зараз і тут будуць.

*Чуецца музыка, заходзяць шчадроўнікі, Шчадрэц, цыганы. Гаспадары запрашаюць усіх да стала, частуюць.*

**1-ы госць**. Цётка Ганна, дзядзька Цярэшка, якія смачныя пачастункі!

**2-і госць**. А давайце нашым гаспадарам песню праспяваем.

Пасеяў дзед грэчку, баба кажа мак.
Гоп, гоп, жонка мая, няхай будзе воля твая.
Няхай так, няхай сяк,
Няхай з грэчкі будзе мак.
Купіў дзедку збана, баба кажа гляк.
Гоп, гоп, жонка мая, няхай будзе воля твая.
Няхай так, няхай сяк,
Няхай з збана будзе гляк.
Злавіў дзедка шчуку, баба кажа рак.
Гоп, гоп, жонка мая, няхай будзе воля твая.
Няхай так, няхай сяк,
Няхай з шчукі будзе рак.
Купіў дзедку світку, баба кажа фрак.

Гоп, гоп, жонка мая, няхай будзе воля твая.

Няхай так, няхай сяк,

Няхай з світкі будзе фрак.

Ой, божа ж мой, божа,

Што я нарабіла.

Я свайго старога дураком зрабіла.

Я свайго старога дураком зрабіла.

Гоп, гоп, жонка мая, няхай будзе воля твая.

Няхай так, няхай сяк,

Няхай будзе дзед дурак.

**Хлопец.** Ой, гляньце, хлопцы, вунь дзяўчаты нешта шэпчуцца, мабыць, варажыць будуць, давайце і мы паслухаем.

**Цыганка** *(хлопцу)*. Ану, пакажы сваю ручку, прадкажу табе лёс твой. Ці будзеш ты шчаслівы ці не. Возьмеш ты дзяўчыну, але не з гэтага сяла, а з суседняга. Будзе ў цябе свая хата, добрая работа.

**Гаспадар**. А мне паваражы!

**Цыганка.** А ты не бегай да сваёй суседкі.

**Цыганка** *(дзяўчыне)*. А ты, прыгажуня, па тваім твары бачу, будзеш шчаслівая і хутка будзе вяселле. Народзіш ты цэлую кучу дзяцей і будзеце вы з мужам жыць разам доўга-доўга.

**Хтосьці з гасцей**. Засядзеліся, загуляліся мы тут. Пабылі ў адной гаспадыні, трэба і да другой пайсці. Усяго добрага! Бывайце здаровыя! З Новым годам! З новым шчасцем!

**1 вядучы**. Яшчэ адно студзеньскае свята - "Вадохрышча". Свята, на якое згадваецца і праслаўляецца Хрышчэнне Ісуса Хрыста на рацэ Іярдан. Вадохрышча—апошняе свята каляднага цыкла. У гэты дзень ва ўсіх храмах адбываецца асвяшчэнне вады. Народ верыў у цудадзейную сілу такой вады і выкарыстоўвалі яе пры розных бытавых выпадках  і здарэннях: яе давалі выпіць

хвораму, ёю пырскалі новую хату перад тым, як засяліцца і ў вулле, каб лепей вяліся пчолы, поле перад сяўбою. На Вадохрышча прыпадалі самыя вялікія маразы, пасля якіх зіма паступова пачынала паварочваць на лета. “На Вадохрышча вельмі сцюдзёна—у жніво вельмі горача”.

**2 вядучы**. На гэта свята людзі ідуць у царкву, свенцяць ваду. Прыйшоўшы дамоў, абсвенчваюць вуглы хаты, хлява і самі п'юць свянцоную ваду. Гэта прыбаўляе сілы, здароўя, веры ў лепшую долю.

**1 вядучы**. Ваду трымаюць у хаце, бо яна служыць лекамі ад розных хвароб як людзям, так і жывёле.

**2 вядучы**. З 7 студзеня па 19 студзеня па народным каляндары праводзіліся святкі. Лічылася,што ў гэты час закладваецца аснова будучага новага года, і таму Святкі праводзілі не толькі ў любові і згодзе з роднымі і блізкімі, але і весела. Давайце і мы павесялімся.

***Праводзяцца гульні:*** **“Музычныя снежкі”.** Вучні становяцца ў круг, у сярэдзіну кладуцца снежкі, на адну менш, чым удзельнікаў. Гучыць мелодыя, вучні ходзяць па кругу, мелодыя спыняецца—вучні хапаюць снежкі, каму не дасталося, той выбывае. Перамагае той, у каго застанецца апошняя снежка.

**“Катанне на санках”.** Да картонкі прывязваецца вяровачка, на “санкі” кладзецца шарык, хто давязе яго, той і выйграў.

**“Сняжкі”**. Яны робяцца з газеты, ставяцца карзіны, хто пападзе найбольш разоў у карзіну, той і выйграў.

*Гаспадар, гаспадыня і дачка ў хаце.*

**Гаспадыня.** Цярэшка, я пайду да суседкі, можа, яна хадзіла сёння ў царкву, хай дасць свянцонай вады.

**Гаспадар**. Здаецца, як бы нехта ідзе да нас, не інакш як суседка.

**Суседка.** Добрага дня вам у хату. З Хрышчэннем вас, з Хрышчэннем! Вось, вадзіцы прынесла.

**Гаспадыня.** Ой, як жа добра!

**Суседка**. Краплю вуглы хаты, каб былі багаты. Даю вам піць, каб было добра жыць. А гэта вазьмі надалей, спатрэбіцца ў гаспадарцы.

**Гаспадыня**. Цярэшка, пайдзі запрасі да нас Тэклю, Маню, Глашу, ды й пра Вольку не забудзься. Пасядзім, пагутарым, пачастуемся. Дачушка, дапамажы мне на стол сабраць.

**Дачка.** Добра, мамка, я хуценька.

*Заходзяць жанчыны, вітаюцца. Гаспадыня садзіць гасцей за стол і частуе іх.*

**1-я жанчына**. Сёння такі снег! А снег на Вадохрышча - добра будуць раіцца пчолы і бульбы вырасце многа.

**2-я жанчына**. Святое Вадохрышча ваду пасвянчае, людзей падкрапляе.

**3-я жанчына**. Вось, жанчынкі, здаецца, нядаўна Каляды пачыналіся, а ўжо і заканчваюцца. Як хутка час прабег. Хочацца, каб Калядкі вярнуліся.

Вы, Калядачкі, вы вярніцеся,
На нас, дзевачак, агляніцеся.
Мы Калядачкам наравіць будзем.
Ды на йгрышчыкі мы хадзіць будзем.

**Суседка.** Паглядзіце, жанчынкі, ужо і вечар настаў. Сцямнела. Трэба ісці жывёлу карміць. Дзякуем вам, Ганна і Цярэшка.

**1 вядучы** На парозе нас сустракае другі месяц года—люты. Звернемся да нашай дошкі і прыгадаем ***прыкметы лютага.***

1.Пытаецца люты, ці добра ногі абуты.

2. Раз люты марозны і сухі, то жнівень  гарачы.

3. Калі ў лютым быў моцны мароз, то зіма павінна працягвацца нядоўга.

4. Які першы дзень лютага, такімі будуць апошнія дзянькі месяца.

**2 вядучы** Якія святы народ святкуе ў лютым? Адно з галоўных свят лютага—Грамніцы, якое святкуецца 15 лютага. Гэта свята яшчэ называецца Стрэчанне.

**1 вядучы** Народ тлумачыў назву свята як сустрэчу зімы з вясною. Другая назва свята пайшла ад Бога Грамоўніка, якому прыпісвалася ўтварэнне веснавых навальніц і дажджоў. Пасля гэтага дня павінна была ўпасці ўлада змрочных бостваў зімы: “На Грамніцы—паўзімы” або “Як прыйдуць Грамніцы—скідай рукавіцы”. Калі ж на Грамніцы здарыўся вялікі мароз, то снег павінен быў праляжаць доўга. А вясна і лета не абяцалі нічога добрага. Грамнічная мяцеліца прадказвала, што вясна затрымаецца даўжэй, чым звычайна”.

**2 вядучы.** На Грамніцы ў царкве свяцілі свечку. Пры гэтым варажылі пра надвор'е. Калі грамнічныя свечкі, як і царкоўныя, трашчалі падчас гарэння - летам чакайце громаў, а чым больш часты і страшны трэск - тым больш моцнымі і частымі будуць летнія навальніцы. Пасля варажбы свечкі тушылі пераварочваннем кнота ўніз, а не задзімалі, як звычайна, таму што згасанне свечкі ад павеваў ветру абяцала чалавеку, які трымаў яе ў руках, смерць на працягу года.

**1 вядучы.** Існавала і такое павер'е: калі ўдасца прынесці з царквы агонь грамнічнай свечкі непатухлым, то гэта пазбавіць ад любога няшчасця, што навісла над сям'ёй, напрыклад выратуе паміраючага.

**2 вядучы** Ва ўсіх славянскіх народаў бадай што самым вясёлым і працяглым святам была Масленіца. З аднаго боку, існуе думка, што Масленіца заканчвае зіму, з другога—што яна святкавалася ў гонар вясны. На Масленіцу людзі гатавалі стравы, сярод якіх важную ролю адыгрывалі сыр, масла, тварог з малаком, абавязкова пяклі бліны.

*(Заходзяць госці, вітаюцца спяваюць песню.)*

У нас сягоння масленіца, Прыляцела ластавіца, Сядзела на тыну, на калу, Кідала масла па каму, Маладая дзяўчына схапіла Ды ў чарапочку стапіла… У на с сягоння масленіца…

**1 вядучы.** Першы дзень Масленіцы называўся “Сустрэчай” ці “Стрэчаннем”.У гэты дзень Масленку страчалі.

**2 вядучы**. Другі дзень “Зайгрышы” ці “Загавіны”. Пачатак катання з горак і хаджэння па вёсцы раджаных.

**1 вядучы.** У сераду цешчы пяклі бліны і чакалі ў госці зяцёў, каб пачаставаць іх блінамі, таму гэты дзень называлі “Цешчыны пачастункі”.

**2 вядучы.** У чацвер святкавалі дзень святога Уласа – абаронцы свойскай жывёлы. Лічылася, што ў гэты дзень павінен прыляцець першы жаваранак. А яшчэ ў гэты дзень ушаноўвалі маладых, якія толькі што пабраліся шлюбам. А таму хлопцу, які ўжо павінен быў жаніцца, але не зрабіў гэтага вешалі на шыю палена на вяроўцы да нагі ланцугом прывязвалі, на замок замыкалі і цягаць прымушалі.

**1 вядучы.** Прыйшоў пяты дзень – пятніца, які называўся “Цешчыны пасядзелкі”. У гэты дзень зяці павінны былі частаваць сваіх любімых цешчаў.

**2 вядучы**. “Залоўчыны пасядзелкі” - так называўся шосты Масленічны дзень. Маладыя нявесткі збіралі да сябе мужаву радню. А дзяўчаты варажылі на суджанага.

**1 вядучы**. Апошні Масленічны тыдзень меў дзве назвы: “Прабачальная нядзеля” і “Праводзіны Масленкі (Зімы)”. У апошні дзень Масленкі бацька сядзеў на куце. І ўсе дзеці, а таксама і ўнукі прыходзілі да яго па чарзе і прасілі прабачэння. А пасля бацька таксама прасіў прабачэння ў кожнага. Казалі: “Прабач, калі саграшыў перад табой справай і языком”.

**2 вядучы**. У гэты ж дзень спальвалі пудзіла, заклікалі Вясну хутчэй прыйсці. Лічылася, што разам з дымам адыходзіць і ўсё дрэннае. Увогуле, гэты дзень яшчэ называўся “загавіны” ці “запускі”. Ідзе пост вялікі на бульбу і квас, хавай чаравікі, лапцей ёсць запас, - спявалі нашы продкі ў нядзелю.

**1 госць**: Мы ў вашу хату не толькі песні прыняслі, але і загадкі.

Што на двары—гарою, а ў хаце—вадою? (Снег)

**2 госць**: Лезе праз акно сізае сукно. Што гэта? (Мароз)

**3 госць**: Што зімою камнем уніз расце? (Лядзяш)

**1 госць:** Усе яго любяць, а як паглядзяць моршчацца? (Сонца)

**2 госць:** Свеціць і грэе, весяліць і ззяе, усю зямлю ажыўляе. (Сонца)

**1 госць:** Пасярод двара стаіць гара, спераду вілы, ззаду мятла. (Карова).

**2 госць**: Хто двума бадаецца, чатырма ходзіць, адным мух ганяе? (Карова).

**1 госць**: І сваё дзіця накарміла і чужых не забыла. (Карова).

**1 вядучы** Так, гэта наша карміліца-карова. У масленічны тыдзень будзем ўспамінаць, аб ёй добрыя словы казаць.

**1 госць:** А пахне ў вас блінамі з маслам! Я бліны б ўплятаў ды галавою матляў!

**2 госць:** Дзіва што! Кажуць жа, што на мазаны блін і кот па-другому глядзіць.

**3 госць:** А колькі ласункаў на стале! Відаць, гаспадары чакалі нас з раніцы..

**Гаспадыня:** Так чакалі ды на стол збіралі, стараліся.

**1 вядучы**. Вось і ўсё**.** Звычаі народа—наша багацце. Скарбніца, што засталася на шчасце, і скарб гэты трэба нам ўсім захаваць, каб потым нашчадкам сваім перадаць. Жывіце шчасліва! Здаровы бывайце! І ўсё, што тут было ўспамінайце!

**2 вядучы**. Усім вам жадаем моцнага здароўя, многа радасці і паболей светлых дзён.

**Разам.** Усяго вам добрага. Чакайце нас праз вясну, лета і восень. Да сустрэчы!

*Гучыць музыка. Спяваючы і танцуючы, госці разыходзяцца.*